# ФУНКЦЫІ ГУБЕРНАТАРСКАЙ КАНЦЫЛЯРЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 30-60 ГГ. XIX СТ.

**Г. С. Кліз**

У сферу дзейнасці губернатара ўваходзіла ўсё, пачынаючы ад функцыянавання адміністрацыйных органаў у губерні і канчаючы станам маралі сярод мясцовых жыхароў. Зразумела, што адной асобе нельга было адолець такую колькасць спраў і абавязкаў, таму губернатар кіраваў губерняй пры дапамозе адміністрацыйных органаў: губернскага праўлення і канцылярыі губернатара.

Губернатарская канцылярыя з'яўлялася сувязным звяном губернатара з падначаленымі ўстановамі і з вышэйшымі органамі ўлады імперыі. Установа прымала ўсю дакументацыю, якая прыходзіла на імя губернатара, адпраўляла выходныя дакументы. Таму асноўнай функцыяй канцылярыі было дакументацыйнае забеспячэнне дзейнасці губернатара. Канцылярыя была неабходна, каб справіцца з адной толькі перапіскай, каб мець магчымасць выконваць шматлікія абавязкі, ускладзеныя на губернатараў [1, с. 138].

Такім чынам, канцылярыя выконвала сакратарскія абавязкі. Яна вяла перапіску па прызначэнню дваранскіх сходаў і па зацвярджэнню дваранскіх выбараў, прадстаўленню да розных узнагарод, якія не маглі быць выкананы ў губернскім праўленні ці прыказе грамадскай апекі, агляду губерні, выкананні рэкруцкіх набораў, па народным харчаванні, зацвярджэнню размеркавання кватэрнай павіннасці, падрадаў і гандлю, па выдачы падарожных, замежных пашпартоў і іншых пасведчанняў, зацвярджэнню планаў і каштарысаў пра лес, прызначаны да вырубкі, і таксаў, па разгляду губернатарам крымінальных, следчых і іншых судовых спраў, а таксама перапіску з ваенным кіраўніцтвам аб руху і выкарыстанні войск. Акрамя гэтага, канцылярыя складала і прадстаўляла ў Пецярбург усёпадданейшыя справаздачы і іншыя ведамасці. У яе рамках засяроджвалася ўся перапіска па сакрэтных справах, даручаных асабіста губернатару, а таксама «не терпящим отлагательства» пытаннях [5, арт. 642]. Выкананне гэтых пытанняў у канцылярыі губернатара было падзелена паміж сталамі і рэгістратурай, дзе вяліся кнігі і рэестры [5, арт. 643].

Канцылярыя з'яўлялася архівам спраў і кніг, якія былі ўжо завершаны і перададзены на пастаяннае захаванне з мэтай іх далейшага выкарыстання. Пры гэтым пад момантам завяршэння разумеецца акт іх брашуравання ці перапляцення, ва ўсякім выпадку, падрыхтоўку да брашуравання.

Аднак на прыкладзе канцылярыі віцебскага губернатара можна сцвярджаць, што архіў гэты насамрэч з'яўляўся свайго роду складам для непатрэбных папер канцылярыі, бо «архіў губернатарскай канцылярыі мае толькі адну вонкавую форму некаторага парадку, так як большая частка спраў знаходзіцца ў звязках і размяшчаецца па паліцах, аднак у сутнасці сваёй архіў знаходзіцца ў поўным беспарадку. Перадача спраў у архіў адбывалася без усялякага парадку, без вопісаў, без распісак і без дакладнага разбірання спраў» [3, а. 120–120 адв.]. Такое становішча архіва можна патлумачыць толькі няўважлівым стаўленнем кіраўніцтва і чыноўнікаў канцылярыі да яго. Так, вядзенне архіва было перададзена аднаму чыноўніку, прытым вольнанаёмнаму, у той час як для разбору архіва і складання дакладнага алфавіту ўсіх спраў патрэбна была праца не аднаго адказнага работніка канцылярыі.

Вядзенне, выкарыстанне, захаванне спраў і кніг пашырала функцыі ўстановы. У канцылярыю звярталіся асобы для пацвярдэння правоў, атрымання пасведчанняў, звестак і інш. Прыклады можна знайсці ў вопісе справам 6-га стала канцылярыі магілёўскага грамадзянскага губернатара за 1846–1847 гг.: «По предписанию г. Министра Юстиций о доставлении сведений касательно приобретения имений чиновниками коллежским секретарем Козлинским и коллежским регистратором Славинским» [4, а. 2], «По предписанию г. Министра Внутренних Дел, о представлении сведений, в какое время приобрели крестьян Депутаты Дворянства Марковецкий и Рагоза» [4, а. 2 адв.], «По отношению Начальника Ковенской Губернии относительно выдачи люстратору Довноровичу свидетельства об утрате Актовых книг» [4, а. 3] і г.д. Справы выконваліся вельмі марудна. Напрыклад, перапіска з астраханскім ваенным губернатарам аб высылцы дакументаў канцылярыстаў мінскага губернатара, якія пераехалі на службу ў Астраханскую губерню цягнулася з 23 кастрычніка 1836 па 30 красавіка 1837 года [2, а. 1–10].

Падводзячы вынік, можна сказаць, што канцылярыя грамадзянскага губернатара прызначана была дапамагчы яму выконваць свае службовыя абавязкі. Яна сканцэнтравала ў сабе ўсё справаводства і з'ўлялася сувязным звяном паміж губернатарам і іншымі адміністрацыйнымі ўстановамі. Праз канцылярыю, як своеасаблівы інфармацыйны цэнтр, праходзілі звесткі аб усіх сферах грамадскага жыцця. Установа выконвала сакратарскія абавязкі. Акрамя гэтага з'ўлялася архівам вырашаных дакументаў. Вядзенне, выкарыстанне, захаванне спраў і кніг пашырала функцыі ўстановы. У канцылярыю звярталіся за пацвярджэннем правоў, атрыманнем розных даведак, пасведчанняў і г.д.

Ускладзеныя на канцылярыю функцыі выконваліся, аднак тэмп і якасць іх выканання былі нездавальняючымі.

**Літаратура**


1. *Андреевский И. Е.* О наместниках, воеводах и губернаторах. Рассуждение магистра гос. права Ивана Андреевского, представленное в Юрид. фак. Имп. С.-Петерб. ун-та для получения степени доктора гос. права. СПб., 1864.
2. Национальный исторический архив Беларуси. Ф.295. Канцелярия минского гражданского губернатора. Оп. 1. Д. 581.
3. Национальный исторический архив Беларуси. Ф. 1430. Канцелярия витебского гражданского губернатора. Оп. 1. Д. 25436.
4. Национальный исторический архив Беларуси. Ф. 2001. Канцелярия могилевского гражданского губернатора. Оп. 1. Д. 373.
5. Свод законов Российской империи, повелением гос. имп. Николая Павловича составленный. Изд.1842 г. [Т. 1-15]. СПб, 1842. Т. II. Ч. 2. Учреждения губернские. 1842.


## ЭТИМОЛОГИЯ ДРЕВНЕЕГИПЕТСКОГО THN (ИСТОРИЧЕСКИЙ ПОДХОД)


**А. А. Костюкевич**


Словом обелиск (от греч. οβελισκος, οβελος – металлический штырь, вертел, прут) [17] древние греки назвали иглоподобный монолит из гранита, выточенный в виде стройной четырехгранной колонны, суженный кверху и заканчивающийся пирамидальным наконечником. Таким образом, греческое значение слова говорит нам только о присутствии на монолите металла и абсолютно не объясняет назначение этих сооружений.

Поэтому нам видится вполне закономерным рассмотреть именно древнеегипетское слово, обозначающее обелиск – thn.

Thn впервые встречается в Текстах пирамид [14, с. 327], т.е. в период Древнего царства (2794 – около 2200 гг. до н.э.) [2]. В научной литературе, посвященной обелискам, существует точка зрения относительно того, что термин thn является производным от слова wbn «светить, восходить» и, соответственно, обозначает «солнечный луч» [9; 20]. Заметим, что Эрман и Грапов не приводят такого значения для термина thn.

Строго говоря, для обозначения «солнечного луча» в древнеегипетском языке существовало определенное слово stwt с соответствующим детерминативом (солнце с лучами), причем его этимология достаточно ясна и слово также впервые встречается в тех же Тесках пирамид [14, с. 567]. Таким образом, мы считаем, что слово thn изначально могло и не иметь значения «солнечный луч».

По своей символике, обелиски были связаны с гелиопольским культом Солнца, что отражено в их трактовке в период Нового царства: обе-